Беларусь : [сайт]. URL: https://www.belstat.gov.by/ofitsialnaya–statistika/realny–sector–ekonomiki/strukturnaja_statistika/osnovnye–pokazateli–deyatelnosti–mikroorganizatsiy–i–malykh–organizatsiy/.

5. Агейко, О. В., Русак, И. Н. Предпринимательская мотивация и малый бизнес. *Научные стремления*. 2020. №. 27. С. 9 – 11.

**УДК 338.14**

**Казінец М. Ц.**
к.э.н., дацэнт,
дацэнт кафедры менеджменту,
УА «Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт»

## КІРАВАННЕ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦКАЙ РЫЗЫКАЙ У СФЕРЫ ІНФАРМАЦЫЙНА-КАМУНІКАЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

Шматлікія даследаванні прадпрымальніцкай сутнасці дазволілі вылучыць яе характэрныя рысы. Да іх, акрамя ініцыятыўнасці, наватарства, незалежнасці прыняцця рашэнняў і адказнасці за іх вынікі, таксама адносяць схільнасць да рызыкі. Прыватным і калектыўным прадпрымальнікам, якія дзейнічаюць у сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, апроч іх уласцівы шэраг спецыфічных прыкмет, якія, з’яўляюцца следствам ўздзеяння асяроддзя функцыянавання:

– больш высокая дынамічнасць;
– больш гнуткая арганізацыя працы;
– падвышаная кліентаарынтаванасць;
– вялікая значнасць інтэлектуальнага капіталу, нематэрыяльных актываў, а таксама інфармацыйных рэсурсаў.

Аналіз развіцця эканомікі Рэспублікі Беларусь на пачатку XXI стагоддзя, у прыватнасці яе электроннай часткі, дазваляе зрабіць выснову, што дадзены сектар пачаў адыгрываць значную ролю і ёсць падставы меркаваць, што ён можа стаць драйверам эканамічнага развіцця ва ўмовах дэфіцыту «традыцыйных» рэсурсаў. Дадзеныя аб павелічэнні значнасці секцыі «Інфармацыя і сувязь» ў фарміраванні валавога ўнутранага прадукту, павышэнні ўдзельнай вагі актыўных прадпрыемстваў дадзенай секцыі, а таксама аб павышаным узроўні чатырохгадовай выжывальнасці арганізацый (у параўнанні з прадпрыемствамі, якія прадстаўляюць «традыцыйныя» галіны) сведчаць аб эфектыўнасці аналізуемай секцыі нацыянальнай эканомікі [1, 2]. Гэта з’яўляецца следствам як перспектыўнасці паслуг, так і ступені спрыяльнасці створаных умоў для развіцця прадпрымальніцкай дзейнасці. Аналіз прывабнасці умоў у сферы інфармацыйных тэхналогій і дзейнасці ў галіне інфармацыйнага абслугоўвання ў краінах рэгіёну дэманструе перавагі Рэспублікі Беларусь у адносінах да іншых краінам рэгіёну (па стане на першую палову 2020 г.). Тым не менш, падзеі апошняга часу (пандэмія каранавірусу SARS-CoV-2, асобныя падзеі іншага неэканамічнага характару і інш.) прадэманстравалі значны ўплыў рызык на эфектыўнасць суб’ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці, якія функцыянуюць у розных галінах нацыянальнай эканомікі, у тым ліку ў сферы інфармацыйна-

камунікацыйных тэхналогій.

Частку рызык, якія аказваюць уплыў, можна аднесці да несістэматычнай (дыверсіфіцыруемай) катэгорыі. Адносна суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці, якія функцыянуюць у сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, на дадзены момант у якасці найбольш значных варта разглядаць камерцыйныя і палітычныя рызыкі.

У тэорыі рызыка-мэнэджменту прынята вызначаць магчымасць выкарыстання тых ці іншых працэдур кіравання ў залежнасці ад спалучэння значэнняў наступных параметраў: 1) памеру патэнцыйнай шкоды (страты) і 2) верагоднасці яе наступу. У выпадку, калі мае месца высокая верагоднасць магчымай шкоды пры нізкім яе патэнцыйным памеры, альбо, наадварот, нізкая верагоднасць пры патэнцыйна вялікім узроўні страт, звяртаюцца да працэдур кіравання, якія маюць на мэце памяншэнне альбо верагоднасці наступлення рызыкоўнай падзеі, альбо зніжэнне патэнцыйнай шкоды. Да абодвух дзеянняў можна аднесці магчымасць пераносу бізнэса ў іншыя юрысдыкцыі. Сапраўды, дзякуючы гэтаму можна ў пэўнай ступені знізіць негатыўны ўплыў камерцыйных рызык, якія выяўляюцца ў зніжэнні эфектыўнасці прадпрымальніцкай дзейнасці (або немагчымасці яе ажыццяўлення) з-за праблем у галіне інфармацыйна-камунікацыйнай інфраструктуры.

Асабліва трэба адзначыць, што ў дачыненні да разглядаемага сектару нацыянальнай эканомікі гэта не сфармуе значных рызык, звязаных са стратай кліентуры з-за рэалізацыі паслуг на знешніх рынках ва ўмовах, калі краіна паходжання не з'яўляецца больш значнай, чым характарыстыкі прадукту. Прэваліраванне замежных кліентаў абумоўлівае нізкі ўзровень фінансавых рызык, звязаных са змяненнем кошту капіталу пры намінаванні атрымліваемых даходаў у больш стабільных валютах. Гэта зніжае ўплыў інфляцыйных рызык і не прыводзіць да прамых фінансавых страт у разгляданых суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці.

Такім чынам, лакацыйных гнуткасць і магчымасць пераносу бізнесу ў сферы электроннай эканомікі – асноўныя чыннікі, якія прадвызначаюць магчымасць выкарыстання такіх метадаў кіравання рызыкай у сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, як памяншэнне верагоднасці альбо патэнцыйнай шкоды. Для забеспячэння прывабных умоў функцыянавання прадпрымальніцкіх структур у дадзеным сектары ў межах беларускай юрысдыкцыі неабходна безумоўна ўлічваць верагоднасць іх прымянення пры распрацоўцы асноўных прынцыпаў рэгулявання бізнесу.

**Спіс літаратуры**

1. Казінец М. Ц. Роля электроннай эканомікі ў Беларусі і фінансавыя аспекты яе канкурэнтаздольнасці. *Экономика и управление: социальный, экономический и инженерный аспекты* : сб. материалов III Межд. науч.-практ. конф., Брест, 19 – 20 ноября 2020 г. / Брестский гос. технич. ун-т . Брест, 2020. С. 6 – 11.

2. Козинец М. Т. Региональные привлекательность и риски предпринимательства в сфере электронной экономики. *Сучасні виклики сталого розвитку бізнесу*: тези виступів Міжнар. наук. конф. Житомир: Житомирська політехніка, 2020. С. 91 – 93.